УДК 821.161.3.09

*А. М. Макарэвіч* (Магілёў, Беларусь)

# УРОК ДАДАТКОВАГА ЧЫТАННЯ І ТВОРЧАЯ РАБОТА Ў КАНТЭКСЦЕ СІСТЭМЫ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ ЛІНІЙ (VIII клас, трэці блок урокаў)

*There is a description of the stages and forms of the work while preparing pupils to the supplementary reading lesson (I. Chigrinov «Kartoshka») and fulfilling creative tasks (Form 8. The third block of lessons).*

Арганізацыя дзейнасці настаўніка і вучняў па сістэме перспектыўных ліній (далей – СПЛ) адпавядае сучасным інавацыйным працэсам у галіне сярэдняй адукацыі. Прапанаваная методыка працы па гэтай сістэме [6] грунтуецца на вывучэнні літаратурных твораў у кантэксце блокаў урокаў, калі паралельна з засваеннем твораў для чытання і вывучэння, для чытання і абмеркавання адначасова здзяйсняецца падрыхтоўка вучняў да ўспрымання і характарыстыкі твораў для дадатковага чытання, а таксама падрыхтоўка школьнікаў да выканання творчых работ. Такі падыход да працэсу выкладання літаратуры спрыяе эфектыўнай і рацыянальнай арганізацыі метадычнай працы настаўніка, калі ён выразна бачыць, асэнсоўвае і, адпаведна, плануе перспектывы навучання, а таксама паэтапна і комплексна арганізуе іх здзяйсненне.

У сувязі з адзначаным вышэй прапануем наступную структуру і змест трэцяга блока ўрокаў у VIII класе па СПЛ.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

**Урокі № 26 – 39**[16]: эпічныя жанры (раздзел "Павольная плынь аповеду" з вучэбнага дапаможніка для восьмага класа) [5, с. 141-259]. **Урок № 40** (урок па творы для дадатковага чытання, далей – УДЧ): І. Чыгрынаў. Апавяданне "Бульба". **Урок № 41** (урок падрыхтоўкі і выканання творчай работы, далей – УТР): пісьмовае сачыненне-разважанне па аповесці В. Быкава "Жураўліны крык".

Змест гэтага блока вызначаецца выхадам на тэарэтычныя паняцці, адпаведныя ім мастацкія з'явы (*эпас як род літаратуры, яго жанры; эпізод, сюжэт, кампазіцыя ў эпічным творы; вобраз-характар і спосабы яго раскрыцця; аўтар-апавядальнік у эпічным творы* і інш. [2, с. 51]); характарыстыка тэарэтычных паняццяў і адпаведных ім мастацкіх з'яў (урокі №№ 26 – 39) дазваляе здзяйсняць выхад на элементы параўнальнай характарыстыкі літаратурных вобразаў, мастацкіх асаблівасцей твораў (УДЧ), а таксама рыхтаваць і непасрэдна выконваць пісьмовае сачыненне-разважанне (УТР) па вывучаным творы.

Апавяданне "Бульба" І. Чыгрынава прадстаўлена ў зборы выбраных твораў пісьменніка [7]; гэты твор можна знайсці таксама на інтэрнэт-старонцы, дзе змешчаны тэксты, прызначаныя для вывучэння ў восьмым класе [8]. Прычыны, па якіх з прадстаўленага ў вучэбнай праграме "Прыкладнага спісу твораў для дадатковага чытання" аддадзена перавага гэтаму твору, наступныя[17].

Па-першае, дадзенае апавяданне мае мастацкі матэрыял да тых тэарэтычных пытанняў, засваенне якіх прадугледжана вучэбнай праграмай у кантэксце трэцяга раздзела вучэбнага дапаможніка і, адпаведна, вызначанага тут (трэцяга) блока ўрокаў. Па-другое, тэматычна апавяданне "Бульба" І. Чыгрынава пераклікаецца з аповесцю В. Быкава "Жураўліны крык", па якой вучні павінны будуць выконваць творчую работу; гэта значыць, што мастацкія факты дадзенага апавядання дапамогуць пашыраць кантэкст разважанняў у творчых работах вучняў па праблемах характару чалавека ў ваенных абставінах. Па-трэцяе, прапанаваны для УДЧ твор – невялікае апавяданне, таму ўспрыманне, асэнсаванне яго матэрыялу і падрыхтоўка да УДЧ "вызваліць" для васьмікласнікаў час, неабходны на працу з дастаткова вялікімі паводле аб'ёму творамі для чытання і вывучэння ў гэтым блоку ўрокаў (урывак з рамана У. Караткевіча "Нельга забыць" ("Паром на бурнай рацэ"), апавяданне Г. Далідовіча "Губаты", аповесць В. Быкава "Жураўліны крык"). Па-чацвёртае, апавяданне "Бульба" І. Чыгрынава дае

[16] Прапанаваная нумарацыя ўрокаў разыходзіцца з нумарацыяй прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання (далей – ПКТП) на два пункты ў сувязі з тым, што ў ПКТП у адносінах да ўрокаў №№ 1 – 8 не ўлічаны: а) урок па творы для дадатковага чытання, б) урок творчай работы.

[17] Аўтары дапаможніка для настаўнікаў "Урокі беларускай літаратуры ў восьмым класе" прапаноўваюць для вывучэння на УДЧ у кантэксце дадзенага блока ўрокаў аповесць М. Стральцова "Адзін лапаць, адзін чунь" [4, с. 146-157].



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

цікавы і прыдатны матэрыял для такога віду работы па літаратуры ў восьмым класе, як "*інсцэніраванне мастацкіх твораў*" [2, с. 54].

**Першы ўрок** гэтага блока (паводле агульнай нумарацыі – гэта ўрок № 26 (Якуб Колас. "Хмарка". Сувязь "Казак жыцця" з фальклорнымі творамі)). Ва ўступнай частцы да яго (адпаведна – да ўсяго блока) варта ахарактарызаваць структуру блока і асаблівасці выхаду на СПЛ у праекцыі на УДЧ і УТР. Праводзячы такую характарыстыку, варта зрабіць наступнае: а) вызначыць час завяршэння папярэдняга знаёмства з тэкстам аповесці В. Быкава "Жураўліны крык" і прапанаваць тэмы сачыненняў-разважанняў па гэтым творы, а таксама разгорнутыя іх планы[18]; б) аб'явіць дату абмеркавання апавядання "Бульба" І. Чыгрынава і, адпаведна, вызначыць найбольш эфектыўны тэрмін знаёмства з гэтым творам; в) рэпрэзентаваць крыніцы, у якіх змешчана апавяданне; г) прадставіць апераджальныя пытанні і заданні да твора; змест, форма пытанняў і заданняў павінны спрыяць эфектыўнай падрыхтоўцы вучнямі інсцэніравання эпізодаў гэтага апавядання.

**Дзявяты ўрок** гэтага блока (паводле агульнай нумарацыі – гэта ўрок № 34 (В. Быкаў. "Жураўліны крык". Чалавек і вайна)). Ва ўступнай частцы да яго мэтазгодна вызначыць і ахарактарызаваць асаблівасці працы з літаратурным матэрыялам у кантэксце гэтай часткі дадзенага блока: а) тэме кожнага ўрока адпавядае тэма сачынення-разважання[19]; назапашаны ілюстрацыйны матэрыял да кожнай з тэм сачынення вучні могуць выкарыстоўваць на тэматычна адпаведным уроку па аповесці В. Быкава і атрымліваць за гэта дадатковыя балы да асноўнай адзнакі за ўрок; б) на кожным уроку па аповесці будзе здзяйсняцца паралельная падрыхтоўка да адпаведнай тэмы сачынення-разважання па гэтым творы; в) апавяданне І. Чыгрынава "Бульба" вучні павінны прачытаць да чацвёртага ўрока па аповесці В. Быкава з той мэтай, каб у працэсе тлумачэння апераджальнага

[18] Паколькі пісьмовае сачыненне-разважанне па вывучаным творы – гэта першая творчая работа такога кшталту для васьмікласнікаў, то варта абавязкова прапаноўваць вучням разгорнутыя планы сачыненняў. Гэта, па-першае, арыентуе на падбор у працэсе чытання аповесці "Жураўліны крык" В. Быкава адпаведнага ілюстрацыйнага матэрыялу для творчай работы; па-другое, пэўным чынам вызначае яе структуру і змест; па-трэцяе, у перспектыве "здымае" праблему спрэчак адносна адзнак за змест сачыненняў; па-чацвёртае, сістэматызаваны падбор матэрыялу да кожнай з тэм у працэсе чытання аповесці (менавіта да кожнай з тэм, бо невядома, якую з іх пераліку пасля прачытання і абмеркавання аповесці на ўроках вучні выберуць для выканання) садзейнічае эфектыўнай падрыхтоўцы васьмікласнікаў да адпаведных урокаў; тэмы сачыненняў павінна пераклікацца з тэмамі ўрокаў па аповесці.

[19] Магчымыя тэмы сачыненняў-разважанняў па аповесці В.Быкава "Жураўліны крык": 1) "Мае ўражанні і вывады па аповесці В. Быкава "Жураўліны крык"; 2) "Мінулае жыццё і ваенны лёс герояў аповесці В. Быкава: праблема вытокаў учынкаў і іх вынікаў"; 3) "Асаблівасці раскрыцця характару герояў аповесці В. Быкава "Жураўліны крык"; 4) "Выпрабаванне вайной: характарыстыка (імя героя) з аповесці В. Быкава «Жураўліны крык»"; 5) "Трагічнасць лёсу герояў аповесці В. Быкава "Жураўліны крык".



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

задання да УДЧ (падрыхтаваць інсцэніраванне эпізодаў апавядання) яны змаглі зразумець сэнс гэтага твора, а таксама мелі час на яго інсцэніраванне.

**Дванаццаты ўрок** гэтага блока (паводле агульнай нумарацыі – гэта ўрок № 37 (В. Быкаў. "Жураўліны крык". Чалавек і лёс)). На гэтым уроку тлумачэнне дамашняга задання павінна складацца з дзвюх частак: а) рэкамендацыі па дамашнім заданні да наступнага ўрока па аповесці В. Быкава; б) апераджальнае заданне да УДЧ: прачытаць апавяданне "Бульба" І. Чыгрынава; падабраць эпізоды, у якіх найбольш выразна праяўляюцца характары герояў твора; скласці творчыя групы выканаўцаў; выбраць рэжысёра і сумесна падрыхтаваць уступнае слова для яго; размеркаваць ролі; распрацаваць сцэнарый інсцэніроўкі выбраных эпізодаў[20].

**УДЧ (урок № 40)**: структура – а) уступнае слова настаўніка да ўрока; б) падрыхтоўка вучняў да інсцэніравання выбраных эпізодаў апавядання; в) выступленне творчых груп выканаўцаў; г) падагульненні і вывады па ўроку; змест – а) характарыстыка настаўнікам асаблівасцей адлюстравання ваенных падзей праз успрыманне дзіцяці і ўспамін дарослых людзей (апавядальніка, старшага лейтэнанта) у апавяданні І. Чыгрынава "Бульба"[21]; вызначэнне парадку працы творчых груп выканаўцаў;

---

[20] Настаўнік можа звярнуць увагу вучняў на магчымыя для інсцэніравання эпізоды: эпізод з шапкай ("*Артылерысты былі вясёлыя людзі. <…> І скупы Сідараў <…> аддаў яе чорнаму артылерысту*" [7, с. 220].); эпізод з аповедам старшага лейтэнанта пра яго жаданне "*бульбы печанай наесціся*" ("*Старшына прынёс плашч-палатку. <…> Амаль побач*" [7, с. 222-223]). Іншыя эпізоды могуць падабраць самі вучні.

[21] Прыкладны змест уступнага слова настаўніка. І. Чыгрынаў (1934 – 1996) адносіцца да пакалення пісьменнікаў, якіх называюць "дзецьмі вайны"; разбуральная навала азмрочыла самую светлую пару іх жыцця. Ваенная тэма – адна з цэнтральных у творчасці гэтага пісьменніка. Да ліку твораў на гэтую тэму адносяцца яго апавяданні "Бульба" (1963, першапачатковая назва "Ля вогнішча"), "У баку ад дарогі" (1964), "Ішоў на вайну чалавек" (1965) і інш., а таксама раман "Плач перапёлкі" (1972) і інш. творы. Далей настаўнік можа выкарыстаць характарыстыку асаблівасцей адлюстравання ваеннай рэчаіснасці ў апавяданні "Бульба", прапанаваную ў "Гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя" [3, с. 550-551]. Пры гэтым варта звярнуць увагу на такія асаблівасці апавядання. Падзеі твора з 1943-га года, што адбыліся ў раёне ракі Бесядзь, узнаўляюцца дарослым чалавекам – апавядальнікам, – які на час дзеяння ў творы быў падлеткам. Вынікам гэтага з'яўляецца тое, што падзеі твора перадаюцца скупа, без падрабязнасцей – так, як іх, магчыма, назіраў апавядальнік у дзяцінстве. Выключэнне складаюць некаторыя пейзажныя апісанні. Яны нібыта падкрэсліваюць: і прырода пакуль што не спрыяе вайскоўцам у іх змагарнай справе ("*Па небе плылі нізкія хмары. <…> Відаць, хмары былі бясплодныя*". "*Верасень быў на сконе. <…> Было няўтульна, нават холадна*" [7, с. 218].). Адзін з эпізодаў у лёсе асобнага вайскоўца ў самым пачатку вайны ўзнаўляецца ў творы гэтым самым вайскоўцам – старшым лейтэнантам. Гэты аповед дваццаціпяцігадовага малодшага афіцэра не толькі стаў вельмі шчымлівым сведчаннем вайскоўца пра тое, як разбуральна дзейнічала вайна на псіхіку асобнага чалавека, а і з'яўляецца тым штуршком для далейшага развіцця падзей, фінал якіх падкрэсліў адну з трагедый мінулай вайны: на яе франтах гінулі маладыя і лепшыя людзі свайго часу. Настаўнік можа прапанаваць вучням развіць на параўнальным узроўні вызначаны вышэй тэзіс у іх сачыненнях па аповесці В. Быкава.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

б) падрыхтоўка вучнямі "сцэнічных пляцовак", магчымых дэкарацый і інш.; в) інсцэніраванне эпізодаў апавядання: уступнае слова рэжысёра (вызначэнне прычын, па якіх абраны пэўны эпізод для інсцэніравання, характарыстыка падзейнай, эмацыйна-псіхалагічнай атмасферы, якую пажадалі перадаць рэжысёр і ўдзельнікі інсцэніроўкі); г) вызначэнне тых асаблівасцей зместу апавядання, якія пашыраюць уяўленні вучняў пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны[22]; абмеркаванне магчымасцей выкарыстання (на супастаўляльным узроўні) уражанняў і вывадаў вучняў па апавяданні ў творчых работах па аповесці В. Быкава "Знак бяды"[23].

**УТР (урок № 41)**: структура – а) праца з першымі (падрыхтаванымі дома) варыянтамі сачыненняў; б) выкананне творчай работы; змест – а) калектыўнае абмеркаванне ўступаў, асноўных частак і заключэння розных (паводле тэматыкі) сачыненняў; б) афармленне канчатковага варыянта сачынення; індывідуальнае кансультаванне настаўнікам вучняў у сувязі з прыватнымі іх пытаннямі адносна зместу, арфаграфічнага, граматычнага ладу сачынення і інш.

Прапанаваныя вышэй этапы і формы працы па СПЛ спрыяюць дасягненню наступных мэт: а) паступовае назапашванне неабходных для УДЧ і УТР фактаў з мастацкай літаратуры; б) фарміраванне ўменняў вобразнага выказвання на падставе ўспрымання асобных мастацкіх твораў і суаднясення іх з іншымі творамі, а таксама тэарэтычнымі крыніцамі; в) фарміраванне ўменняў супастаўляльнай характарыстыкі вобразаў, мастацкіх сродкаў і праблематыкі літаратурных твораў. Усё адзначанае садзейнічае рацыянальнай арганізацыі працы (самастойнай і на ўроку) васьмікласнікаў па СПЛ.

---

[22] Напрыклад, падрыхтоўка артылерыстаў да бою: тэзіснасць і лаканічнасць узнаўлення падзей ("*Ля вясковых могілак ужо бегалі артылерысты.* <...> *Гулі маторы. І гэты гул іхні то нарастаў, нібы станавіўся сцяною, то заціхаў*" [7, с. 217-218]. "*А пад самы вечар* <...> *Коней артылерысты не распрагалі: павесілі ім на галовы брызентавыя вёдры, і коні лянiва хрумсталі авёс*" [7, с. 219].); "*бой на Бесядзі*" ("*Уначы пачаўся на Бесядзі бой.* <...> *«трыццацьчацвёркі», рухаючыся ўздоўж ракі з усходу на захад, узламалі нямецкую абарону*" [7, с. 224].); трагедыя асобнага чалавека ў ваенных абставінах (гісторыя настаўніцы Моркаўкі-Брыкікі: яна ў ваенны час спрабавала вучыць падлеткаў, яе "*ўзброеныя людзі ў цывільным, можа, нават і партызаны*" ноччу "*паднялі з ложка* <...> *і павялі з сабой*" [7, с. 224], каб (магчыма) расстраляць); асаблівасці ўспрымання ваенных падзей падлеткамі – героямі апавядання ("*У сорак трэцім мы былі яшчэ зусім малыя* <...> *Дык і думалася – а можа, якраз тупае бацька вось так у страі, і не пускаюць яго камандзіры дамоў, крый бог, пройдзе міма*" [7, с. 218].).

[23] Напрыклад, аповед старшага лейтэнанта пра "*раны сорак першага года*": непамерна вялікія страты абаронцаў Радзімы ("*Недзе пад Гомелем гэта было.* <...> *Так і бадзяліся галодныя, пакуль не натрапілі на хлапчукоў, такіх вось* <...>". "*Можа.* <...> *толькі нават раны ад сорак першага ныюць па начах мацней, чым тыя, што пасля былі*" [7, с. 222].); канстатацыя ўросту і апісанне знешнасці старшага лейтэнанта, які загінуў у баі пад Бесяддзю ("*Гадоў яму было* <...> *ў старшага лейтэнанта былі да таго ж цёмныя бровы і чорныя вейкі*" [7, с. 223]); чаканне падлеткамі старшага лейтэнанта (ён, магчыма, загінуў) ля вогнішча з печанай бульбай ("*Мы цярпліва сядзелі каля вогнішча* <...> *Але старшы лейтэнант не прыйшоў...*" [7, с. 225]).



Могилевский государственный университет имени А.А.Кулешова

## Літаратура:


1. Беларуская мова і літаратура. 8–9 кл. : прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі / І.М. Саматыя [і інш.]. – Мінск : НІА : Аверсэв, 2012. – С. 32–98.
2. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура V – XI класы / Зацв. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2012. – 127 с.
3. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Аддзне гуманітарных навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я.Купалы; навук. рэд. У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. – Мінск : Бел. навука, 2002. – Кн. 2. – С. 549-570.
3. *Карухіна, В.А.* Урокі беларускай літаратуры ў 8 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з беларус. і рус. мовамі навучання / В.А. Карухіна, П.І. Лявонава, І.М. Слесарэнка. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 214 с.
4. *Лазарук, М.А.* Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М.А. Лазарук, В.І. Русілка, І.М. Слесарава. – Мінск : Нац. ін-т. адукацыі, 2001. – 360 с.
5. *Макарэвіч, А.М.* Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры : урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў V–VI класах / А.М. Макарэвіч // Беларуская мова і літаратура. – 2013. – № 7. – С. 9–16.
6. *Чыгрынаў, І.* Выбраныя творы : у 3 т. / І. Чыгрынаў. – Мінск : Маст. літ., 1984. – Т. 1. – С. 217–225.
7. Рэжым доступу : http://knihi.com/skola/8.html.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова